


ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Гомельскі ЎНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМІТЭТА ЛКСМБ
І ПРАФКОМАЎ ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА ЎНІВЕРСІТЭТА

№ 38 (524) | Пятніца, 31 снежня 1982 года | Газета заснавана ў верасні 1969 года. Выходзіць раз у тыдзень | Цана 2 кап.




## УПЭЎНЕНЫМ КРОКАМ—НАПЕРАД!

Юбілейны для нашай шматнацыянальнай Краіны Саветаў 1982 г. адыходзіць у гісторыю. Ён упісаны яшчэ адной яркай старонкай у слаўны летапіс СССР. Савецкія людзі сваёй самаадданай працай многае зрабілі для далейшага эканамічнага і сацыяльнага развіцця першай у свеце сацыялістычнай дзяржавы, умацавання яе абароннай магутнасці, пераўтварэння ў жыццё рашэнняў XXVI з'езда КПСС.

Адметнасцю мінулага года з'яўляецца і тое, што на майскім Пленуме ЦК КПСС была прынята Харчовая праграма — дакумент, які сведчыць аб пастаянных клопатах Камуністычнай партыі і Савецкага ўрада аб няўхільным павышэнні дабрабыту народа.

Для шматмільённай арміі камсамольцаў нашай краіны 1982 год знамянальны і як год XIX з'езда ВЛКСМ, які вызначыў новыя арыенціры для плённай працоўнай дзейнасці савецкай моладзі.

Важнымі падзеямі азнаменаваўся фініш юбілейнага года. Усе мы знаходзімся пад уражаннямі лістападаўскага Пленума ЦК КПСС і сёмай сесіі Вярхоўнага Савета СССР дзесятага склікання, абмеркаваўшых і вызначыўшых планы эканамічнага і сацыяльнага развіцця краіны на новы, 1983 год. Асаблівыя пачуцці гордасці за нашую любімую Радзіму мы перажылі ў дні святкавання яе юбілею, у час сумеснага пасяджэння ў Крамлёўскім Палацы з'ездаў ЦК КПСС, Вярхоўнага Савета СССР і Вярхоўнага Савета РСФСР, на якім з яркай, хвалюючай і натхняючай прамовай выступіў Генеральны сакратар ЦК КПСС таварыш Ю. У. Андропаў.

У новы, 1983 год мы ўступаем з яснымі мэтамі і канкрэтнымі задачамі. Яны нялёгкія і вельмі адказныя, патрабуюць ад кожнага калектыву мабілізаванасці і самаадданасці, поўнага выкарыстання наяўных магчымасцей і рэзерваў.

З большай аддачай патрэбна папрацаваць і вучоным, выкладчыкам, усім супрацоўнікам, студэнтам і аспірантам нашага ўніверсітэта. Свае намаганні неабходна накіроўваць на дасягненне больш высокіх рубяжоў па ўсіх паказчыках вучэбна-выхаваўчай і навукова-даследчай работы, грамадскай дзейнасці. Мы павінны зрабіць усё неабходнае, каб забяспечыць Гомельскаму дзяржаўнаму ўніверсітэту перадавыя пазіцыі ў сістэме вышэйшай школы Савецкай Беларусі.

Горача віншуем Вас, дарагія таварышы, з Новым, 1983 годам. Новых Вам поспехаў і здзяйсненняў у імя далейшага росквіту нашай любімай Айчыны, захавання і ўмацавання міру на ўсёй планеце!

РЭКТАРАТ, ПАРТКОМ, ПРАФКОМ,
КАМІТЭТ ЛКСМБ.

## НА ЎРАЧЫСТЫМ СХОДЗЕ

Як самае вялікае і радаснае свята сустрэлі і адзначылі савецкія людзі 60-годдзе ўтварэння СССР. У нашым універсітэце ўрачысты сход, прысвечаны гэтай гістарычнай даце, адбыўся 25 снежня.

Уступным словам сход адкрыў сакратар парткома М. І. Старавойтаў.

Аднадушна пад апладысменты выбіраецца ганаровы прэзідыум у саставе Палітбюро ЦК КПСС.

З дакладам аб 60-годдзі ўтварэння СССР выступіў рэктар ГДУ акадэмік АН БССР Б. В. Бокуць.

Удзельнікаў урачыстага сходу цёпла віталі член КПСС з 1929 года кавалер ордэнаў Леніна і Працоўнага Чырвонага Сцяга загадчык кафедры батанікі і фізіялогіі раслін прафесар Ф. М. Харытановіч, асістэнт кафедры беларускай літаратуры дэпутат гарадскога Савета народных дэпутатаў В. К. Шынкарэнка, студэнтка трэцяга курса матэматычнага факультэта ленінская стыпендыятка Валянціна Малашанка, юныя ленінцы падшэфнай СШ № 24.

Ва ўрачыстай абстаноўцы быў зачытаны загад па ўніверсітэту, у якім рэктар Б. В. Бокуць павіншаваў калектыў ГДУ са слаўным юбілеем Краіны Саветаў, а лепшым выкладчыкам, супрацоўнікам і студэнтам за дасягнутыя поспехі ў працы, вучобе і грамадскай дзейнасці аб'явіў падзяку. Групе таварышаў, якія дасягнулі найбольш высокіх паказчыкаў у юбілейным сацыялістычным спаборніцтве, уручаны Ганаровыя граматы і Граматы Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР, Ганаровыя граматы рэктарата, парткома, прафсаюзных і камсамольскага камітэтаў універсітэта.

Урачысты сход закончыўся вялікім святочным канцэртам мастацкай самадзейнасці.



*Мы—інтэрнацыяналісты*

# ЗОРНЫ ЧАС ЮНАЦТВА

**Адным з захапленняў студэнта гісторыка-філалагічнага факультэта, члена універсітэцкага Клуба інтэрнацыянальнай дружбы «Саюз» Віктара Лютынскага стала філатэлія. Прычым, яго калекцыя ў пераважнай колькасці ўтрымлівае маркі, прысвечаныя моладзі, студэнцтву. Мы прапануем вашай увазе яго расказ аб знамянальных у маладзёжным руху падзеях і прысвечаных ім паштовых марках.**

Кожны год мы адзначаем Сусветны дзень моладзі. Пачатак гэтаму святу быў пакладзены ў 1955 годзе, калі заснавалася Сусветная федэрацыя дэмакратычнай моладзі (СФДМ).

Цяжкім і складаным быў шлях прагрэсіўнай моладзі планеты да аб'яднання ў адзіную арганізацыю. Для гэтага ў Лондане сабраліся 437 дэлегатаў з 63 краін, каб правесці сваю ўстаноўчую канферэнцыю. Яе скліканню і рабоце ўсяляк перашкаджалі рэакцыйныя сілы, якія не хацелі, каб моладзь планеты аб'ядналася для сумеснай барацьбы за мір і сацыяльны прагрэс. У ходзе самой сустрэчы прадстаўнікі розных кансерватыўных маладзёжных арганізацый Францыі, Велікабрытаніі і некаторых іншых краін спрабавалі перашкодзіць выпрацоўцы адзіных рашэнняў. Аб той вострай барацьбе, якая разгарэлася на канферэнцыі, успамінае яе ўдзельнік, кіраўнік дэлегацыі савецкай моладзі, у той час першы сакратар ЦК ВЛКСМ Мікалай Міхайлаў у сваёй кнізе «Спакой нам толькі сніцца». «Тым не менш, — піша ён, — галоўным зместам канферэнцыі стала ідэя барацьбы супраць фашызму, за прадухіленне новай вайны, за паспяховае рашэнне пасляваенных праблем моладзі».

Канферэнцыя прайшла пад лозунгам адзінства, узаемаразумення паміж прагрэсіўнай моладдзю ўсіх кантынентаў.

У жніўні 1946 года ў Празе быў створаны Міжнародны саюз студэнтаў. СФДМ і МСС сталі ініцыятарамі і актыўнымі ўдзельнікамі Сусветных фестываляў моладзі і студэнтаў.

І Сутветны фестываль моладзі і студэнтаў адбыўся ў 1947 годзе ў г. Прага.

Складанай была палітычная атмасфера планеты. Сусветны імперыялізм не страціў надзеі задушыць сацыялізм. З Амерыкі і Заходняй Еўропы задзьмулі вятры «халоднай вайны». У гэтых умовах прадстаяла правесці першы форум моладзі. Рэакцыйныя ўрады многіх краін перашкаджалі выезду дэлегатаў на фестываль. І тым не менш 25 ліпеня Злата Прага прымала ў сябе семнаццаць тысяч маладых людзей з 71 краіны.

Разнастайнай і насычанай была праграма фестывалю. Адным з галоўных мерапрыемстваў быў актыўны ўдзел дэлегатаў у аднаўленні разбуранай фашыстамі вёскі Лідзіцэ. Гэта было глыбока сімвалічным — моладзь планеты будавала новы свет, свет без вайны. 400 удзельнікаў фестывалю выехалі ў Югаславію на будаўніцтва чыгункі, многія — на маладзёжныя будоўлі Чэхаславакіі, дапамагалі адбудоўваць разбураныя вайной гарады ў Балгарыі і Польшчы.

Потым лепшых прадстаўнікоў моладзі планеты прымалі Будапешт і Вена, Хельсінкі і Бухарэст, Сафія, Варшава і Берлін.

У 1957 годзе пасланцоў прагрэсіўнай моладзі свету цёпла і сардэчна сустрэла сталіца першай у свеце сацыялістычнай дзяржавы, старажытная і вечна маладая Масква. З 131 краіны на VI Сусветны фестываль моладзі і студэнтаў прыехалі 34 тысячы дэлегатаў.

Паўмільённая маніфестацыя моладзі за мір, семінары, дыскусіі, сустрэчы, перšы на фестывалях студэнцкі клуб — усё гэта было ў Маскве. Фестываль ператварыўся ў захапляючае свята міру і дружбы моладзі ўсіх кантынентаў.

Тэма фестываляў моладзі знайшла шырокае адлюстраванне ў сусветнай філатэліі. У 1947 годзе піянерам у выпуску паштовых марак, прысвечаных фестывалям, стала Чэхаславакія. На першай марцы былі адлюстраваны дзяўчаты трох нацыянальнасцей, аб'яднаных эмблемай СФДМ. З таго часу былі выпушчаны дзесяткі паштовых сувеніраў, прысвечаных фестывалям.

Шырока адлюстраваны VI маскоўскі фестываль у савецкай філатэліі. Было выпушчана 10 марак і адзін паштовы блок. Упершыню ў гісторыі фестываляў у Маскве была праведзена Міжнародная філатэлістычная выстаўка. У 1978 годзе напярэдадні XI Сусветнага фестывалю кубінская пошта выпусціла серыю марак, прысвечаных сталіцам папярэдніх дзесяці фестываляў.

**В. ЛЮТЫНСКІ,**
**студэнт гістфіла, член КІДа «Саюз».**




# НАВАГОДНЯЯ МАЗАІКА

**ЗАГАД ДЗЕДА МАРОЗА**

Студэнта А. Лінскага, які згубіў стыпендыю, выдадзеную яму старастай, лічыць разявай.

**ПЕРАДНАВАГОДНІЯ АБ'ЯВЫ**

Паважаныя жыхары інтэрната ў Валатаве! На навагодняе свята ліфт у інтэрнаце працаваць не будзе. Бліжэйшы працуючы ліфт— у доме насупраць.

**СВЯТОЧНЫ ТОРТ «ДЭКАНАТ»**

Бярэцца 50 залікован, густа прастаўляюцца штампы, дабаўляецца крыху дробнанарэзаных заліковых ведамасцей. Усё гэта старанна перамешваецца са строгай вымовай, а затым змочваецца студэнцкімі слязамі і ставіцца на пяць гадоў у дэканацкі сейф. Калі за гэты час торт не пакрыўся загадам аб адлічэнні, то ён упрыгожваецца зверху дыпломам і з шырокай усмешкай падаецца да святочнага стала. Дзяліць — па густу.

З НОВЫМ ГОДАМ СЯБРЫ-СТУДЭНТЫ!



**У ТВОРЧАЙ АТМАСФЕРЫ**

Поўнае ўзаемаразуменне пануе ў калектыве лабараторыі № 2. Тут усе супрацоўнікі разумеюць адзін аднаго з паўкрыку.

**ПАРАДЫ ДЗЕДА МАРОЗА ПЕРАД СЕСІЯЙ**

Калі табе дадуць лінзу і папросяць паказаць фокус, смела адказвай, што прыйшоў здаваць экзамен, а не паказваць фокусы.

* * *

Бібліятэка — гэта месца, дзе можна спісваць абсалютна спакойна, не баючыся, што за гэта цябе пакараюць.

**ТЛУМАЧАЛЬНЫ СЛОЎНІК ДЗЕДА МАРОЗА**

Ведамасць бывае двух відаў: экзаменацыйная і стыпендыяльная. Першая істотна ўплывае на другую.

**ВЫРАЗЫ**

Ударыўся ў навуку, але атрымаў траўму.

Колькі разоў браў сябе ў рукі, што ва ўсіх, хто яго акружае, яны зусім апусціліся.

**НОВАЕ Ў ВУЧЭБНЫМ ПРАЦЭСЕ**

У наступным 1983 годзе з мэтай жорсткай барацьбы са спісваннем, дацэнт Жмуркін будзе прымаць экзамены ў поўнасцю зацямнёнай аўдыторыі.

**ПЕРАДНАВАГОДНІЯ ДЫЯЛОГІ ВЫКЛАДЧЫКА І СТУДЭНТА**

Дацэнт: За цэлых тры месяцы вы не змаглі напісаць курсавую работу?!

Студэнт: Вы памыляецеся, я не змог напісаць яе за апошнія тры дні.

**ВУЧЭБНЫЯ ДАПАМОЖНІКІ, ВЫДАДЗЕНЫЯ Ў 1982 ГОДЗЕ**

**«Арганізацыя сувязі»** — аўтар Ванька Жукаў.

**«Асновы юстыцыі»** — Раскольнікаў.

**«Сямейнае права»** — Дон Жуан.

**«Пашпартны ўлік»** — Містэр Ікс.

**«Швейная справа»** — Трышка.




**Без слоў.**




*Апавяданне*

# ЛІСТ ДАДОМУ

Добры дзень, дарагія тата і мама! Ужо дзве гадзіны ночы, а я сяджу ў інтэрнаце перад дзвярыма ў свой пакой і пішу вам пісьмо, таму што ў пакой мяне не пускаюць. Кажуць, сёння не мая чарга начаваць. Вочы зліпаюцца, але заснуць не магу, таму што сяджу на стуле з адной ножкай. Другіх у нас у інтэрнаце няма. А таму, каб не заснуць, пішу вам пісьмо...

Дарагія мае, я вельмі без вас сумую — прышліце, калі ласка, грошай! Таму што вашага апошняга пісьма, у якім вы прыслалі мне сорак пяць рублёў, я не атрымаў. Таму вось ужо некалькі дзён, як я нічога не ем. Толькі п'ю. Хацеў уладкавацца ў прафілакторый. Кажуць, там добра. Харчаванне трохразовае: панядзелак, серада, пятніца... Але ў прафкоме сказалі, што не дадуць туды пуцёўку, а, наадварот, запісалі ў дружыну. Я ў яе два разы пахадзіў і выпісаўся. Адразу, як з бальніцы выпісалі, так і выпісаўся. Проста спачатку мы хуліганаў лавілі. А як мы іх злавілі, дык яны нас лавіць пачалі! Таму гіпс мне ў платнай паліклініцы накладвалі. Так што добра б яшчэ трыццатку накінуць, таму што ад павышанай стыпендыі я адмовіўся, а простую мне ніхто не плаціць.

А так усё добра. Праўда, нядаўна мае сябры па паверху мяне ў сваю абшчыну прынялі. Гэта значыць, што да гэтага маім было, цяпер стала агульным. І штаны крымпленавыя, якія дзядзя Грыша прыслаў, таксама. У іх цяпер усе жаніцца ходзяць.

Тата, калі будзе настрой, вышлі грошы. Ста дваццаці — ста пяцідзесяці на штаны павінна хапіць...

Ну вось, а так усё ў мяне добра. Пішыце часцей! Як вы? Як бабуля? Ці здаровая яна, ці атрымлівае рэгулярна пенсію? Калі так, то чаму даўно не піша? Адным словам, памятайце, што ў вас ёсць сын, які ніколі вас не забывае. І, калі вам будзе цяжка, то высылайце— ён дапаможа.

Ваш сын — Сярожа.

Р. S. Лепш, калі адказ вы перавядзеце тэлеграфам, тым больш, што зусім хутка Новы год!

**(«Студенческий меридиан»).**



**Малюнкі даслала Снягурка ад Т. Бабровай, А. Кананец, Р. Дубяка.**

Рэдактар Ул. БАЛОГА.

«Гомельский университет» — орган парткома, ректората, комитета ЛКСМБ и профкомов Гомельского государственного университета (на белорусском языке), Гомельская фабрыка «Палесдрук» Дзяржкамітэта БССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю. Гомель, Савецкая, 1. Аб'ём — 2 друк. аркуш. Тыраж 2000 экз.
Наш адрас: вул. Савецкая, 104, п 3-11, т. 56-16-52.

АЗ 20790 Заказ 7229